Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 22 (531) Субота, 22 чэрвеня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

# Слава героям-касманаўтам Валянціне Церашковай і Валерыю Быкоўскаму!

# Інфармацыйнае паведамленне

## *аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза*

18 чэрвеня 1963 года ў Вялікім Крамлёўскім палацы адкрыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС. Пленум адкрыў Першы сакратар ЦК КПСС таварыш **М. С. Хрушчоў.**

На парадку дня Пленума пытанне: «Чарговыя задачы ідэалагічнай работы партыі». З дакладам выступіў сакратар ЦК КПСС тав. **Л. Ф. Ільічоў.**

У рабоце Пленума ЦК прымаюць удзел сакратары ЦК кампартый саюзных рэспублік, якія ведаюць пытаннямі ідэалогіі, а таксама загадчыкі ідэалагічных аддзелаў, першыя сакратары прамысловых і сельскіх крайкомаў і абкомаў партыі, што не ўваходзяць у састаў Цэнтральнага Камітэта, сакратары прамысловых і сельскіх крайкомаў і абкомаў партыі, якія ведаюць пытаннямі ідэалогіі, першыя сакратары акругкомаў, некаторых гаркомаў і райкомаў партыі буйных прамысловых цэнтраў, сакратары некаторых прамыслова-вытворчых парткомаў і парткомаў вытворчых калгасна-саўгасных упраўленняў важнейшых сельскагаспадарчых раёнаў, сакратары буйных партыйных арганізацый прамысловасці, будаўніцтва, сельскай гаспадаркі, першыя сакратары ЦК ЛКСМ саюзных рэспублік і раду крайкомаў і абкомаў ВЛКСМ, кіруючыя работнікі Акадэміі навук СССР, Акадэміі грамадскіх навук, Інстытута марксізма-ленінізма, Вышэйшай партыйнай школы, цэнтральных газет і часопісаў, радыё і тэлебачання, ТАСС, Усесаюзнага таварыства «Знание» і іншых цэнтральных ідэалагічных устаноў і арганізацый, прадстаўнікі саюзаў пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, тэатральных дзеячоў, Аргкамітэта кінаработнікаў СССР і саюзных рэспублік; намеснікі Старшынь Саветаў Міністраў саюзных рэспублік, якія ведаюць пытаннямі культуры, міністры культуры, вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, асветы, старшыні камітэтаў па радыёвяшчанню і тэлебачанню, кіраўнікі тэлеграфных агенцтваў саюзных рэспублік, старшыні дзяржаўных камітэтаў СССР і РСФСР, прэзідэнты акадэмій навук і дырэктары філіялаў Інстытута марксізма-ленінізма, партыйных школ саюзных рэспублік, рэдактары рэспубліканскіх, краявых і абласных газет, дырэктары саюзных, рэспубліканскіх, краявых і абласных выдавецтваў, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў і школ, прапагандысты, агітатары, работнікі клубаў і бібліятэк, партыйна-палітычныя работнікі Узброеных Сіл, адказныя работнікі апарату ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР і Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Камітэта партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР.

У адрас Пленума паступіла прывітанне касманаўтаў таварышаў В. У. Церашковай і В. Ф. Быкоўскага з бартоў караблёў «Усход-5» і «Усход-6».

Пад бурныя апладысменты ўдзельнікі Пленума накіравалі героям космасу прывітанне з пажаданнем паспяховага завяршэння палёту.

★ ★ ★

На Пленуме пачалося абмеркаванне даклада сакратара ЦК КПСС тав. **Л. Ф. Ільічова** «Чарговыя задачы ідэалагічнай работы партыі». На вячэрнім пасяджэнні выступілі таварышы: **Н. Г. Ягорычаў** (першы сакратар Маскоўскага гарадскога камітэта КПСС), **Г. І. Папоў** (першы сакратар Ленінградскага гарадскога камітэта КПСС), **А. Д. Скаба** (сакратар ЦК КП Украіны), **С. В. Міхалкоў** (сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў РСФСР), **В. П. Ялюцін** (міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР).

Старшынствуючы на Пленуме тав. **Л. І. Брэжнеў** паведаміў, што з борта касмічнага карабля «Усход-5» была атрымана радыётэлеграма касманаўта тав. Быкоўскага, у якой ён прасіў ЦК КПСС аб прыёме яго ў рады КПСС. ЦК КПСС разгледзеў гэту просьбу тав. Быкоўскага і пастанавіў прыняць яго ў члены Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

★ ★ ★

19 чэрвеня 1963 года на Пленуме Цэнтральнага Камітэта КПСС працягвалася абмеркаванне даклада сакратара ЦК КПСС тав. **Л. Ф. Ільічова** «Чарговыя задачы ідэалагічнай работы партыі».

На ранішнім пасяджэнні выступілі таварышы: **І. Юсупаў** (першы сакратар ЦК КП Казахстана), **А. М. Токараў** (першы сакратар Куйбышаўскага прамысловага абкома КПСС), **А. І. Аджубей** (галоўны рэдактар газеты «Известия»), **В. А. Сяроў** (першы сакратар праўлення Саюза мастакоў РСФСР), **З. Н. Нурыеў** (першы сакратар Башкірскага абкома КПСС), **А. В. Раманаў** (старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў СССР па кінематаграфіі), **Ф. А. Табееў** (першы сакратар Татарскага абкома КПСС), **Ц. Н. Хрэннікаў** (першы сакратар праўлення Саюза кампазітараў СССР), **В. Е. Чарнышоў** (першы сакратар Прымарскага прамысловага крайкома КПСС).

Бурнымі, працяглымі апладысментамі, прывітальнымі воклічамі ўдзельнікі Пленума сустрэлі паведамленне таварыша М. С. Хрушчова аб тым, што першая ў свеце жанчына-касманаўт Валянціна Уладзіміраўна **Церашкова** і касманаўт Валерый Фёдаравіч **Быкоўскі** паспяхова завяршылі праграму працяглага касмічнага палёту і паспяхова прызямліліся ў зададзеным раёне.

На вячэрнім пасяджэнні выступілі таварышы: **К. А. Фурцава** (міністр культуры СССР), **Б. Б. Гарадавікоў** (першы сакратар Калмыцкага абкома КПСС), **А. А. Епішаў** (начальнік Галоўнага палітычнага ўпраўлення Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту), **С. К. Тока** (першы сакратар Тувінскага абкома КПСС).

Пленум ЦК КПСС працягвае работу.

# Паведамленне ТАСС

**Сумесны палёт касмічнага карабля-спадарожніка «Усход-6», пілатуемага першай у свеце жанчынай-касманаўтам грамадзянкай СССР Церашковай Валянцінай Уладзіміраўнай, і касмічнага карабля-спадарожніка «Усход-5», пілатуемага касманаўтам грамадзянінам СССР Быкоўскім Валерыем Фёдаравічам, паспяхова завершан.**

**У адпаведнасці з праграмай сумеснага палёту 19 чэрвеня 1963 года караблі «Усход-6» і «Усход-5» прызямліліся ў зададзеных раёнах Савецкага Саюза.**

**Карабель «Усход-6» зрабіў пасадку на разліковым 49-м вітку ў 11 гадзін 20 мінут па маскоўскаму часу за 620 кіламетраў на паўночны ўсход ад горада Караганды.**

**Услед за гэтым на разліковым 82-м вітку ў 14 гадзін 06 мінут зрабіў пасадку карабель «Усход-5» за 540 кіламетраў на паўночны захад ад горада Караганды.**

**У адпаведнасці з разлікам абодва касмічныя караблі прызямліліся на адной шырыні — 53 градусы.**

**У местах прызямлення герояў-касманаўтаў сустрэлі групы забеспячэння пасадкі, сябры, урачы, журналісты і спартыўныя камісары.**

**Касманаўты Валянціна Уладзіміраўна Церашкова і Валерый Фёдаравіч Быкоўскі адчуваюць сябе добра.**

# Партыйны камітэт БДУ абмеркаваў пытанне аб падрыхтоўцы цаліннікаў да ад'езду

Днямі на пасяджэнні партыйнага камітэта БДУ была заслухана справаздача начальніка штаба цаліннікаў К. Сучкова аб падрыхтоўцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў да ад'езду. Камітэт камсамола універсітэта разам са штабам правялі вялікую растлумачальную і арганізацыйную работу сярод студэнтаў. 300 чалавек выказалі жаданне паехаць на саўгасныя будоўлі Уральскай вобласці. Створаны 5 будаўнічых атрадаў, якія будуць працаваць у чатырох саўгасах Зеляноўскага тэрытарыяльнага ўпраўлення. У 5-м будтрэсце Мінска студэнты праходзяць практыку, набываюць будаўнічыя спецыяльнасці.

Аднак побач са станоўчымі фактамі былі ўскрыты значныя недахопы ў рабоце камітэта камсамола і штаба цаліннікаў па падрыхтоўцы да ад'езду на цаліну. Яшчэ не ўсе студэнты прайшлі медыцынскі агляд. Не поўнасцю падрыхтаваны пасцельныя прыналежнасці, аптэчкі, палаткі, спартыўны інвентар. Вакол гэтых пытанняў ідзе нямала размоў, якія не прыносяць пакуль што справе карысці. Бо патрэбна канкрэтная арганізацыйная работа.

Камітэт камсамола і штаб цаліннікаў праводзяць карысную справу: арганізавалі збор кніг для цалінных бібліятэк сярод прафесарска-выкладчыцкага саставу, аспірантаў і студэнтаў.

У прынятай пастанове партыйны камітэт намеціў канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на хутчэйшае выпраўленне адзначаных недахопаў і на высокую арганізацыю падрыхтоўкі да ад'езду.

# Вучыць альбо вывучаць?

Англійскую мову на нашым I курсе вячэрняга аддзялення журналістыкі вывучаюць, відаць, не для таго, каб авалодаць ёю, а каб адбыць нейкую павіннасць. Ужо ў першым семестры, калі стварылася пачынаючая група, гэты прадмет адсунуўся на задні план. Тым, хто ўжо шэсць гадоў вывучаў мову ў школе, было нецікава сядзець і вучыць алфавіт. Пачынаючым жа, каб дагнаць іх, прыходзілася спяшацца, брацца за новую тэму, не засвоіўшы старой.

Згубіць цікавасць да прадмета— самае дрэннае, што можа здарыцца. А гэта здарылася ў нас.

Вось студэнт стаіць ля дошкі, ён напісаў паўслова і задумаўся. Не ведае, якую літару далей пісаць.

—Ну, пішыце літару «і»...

Такія сцэнкі адбываюцца ў нас кожны раз.

Калі мы ішлі ва універсітэт, то лічылі, што многаму навучаць нас, у тым ліку і замежнай мове. Зразумела, вучыць трэба самому, а ВНУ дае сістэму ведаў. У вывучэнні англійскай мовы няма і гэтай сістэмы, якая давала б магчымасць вывучаць мову самастойна. За першы год навучання мы прайшлі шмат граматычных правіл, прачыталі шмат тэкстаў, папоўнілі слоўнікавы запас да 300 слоў. Але каб давялося папрасіць, напрыклад, у англічаніна шклянку вады, той не зразумеў бы, што ад яго патрабуюць. Мы пыталіся ў нашай выкладчыцы Надзеі Пятроўны Нягода, як будзем валодаць англійскай, калі выйдзем з універсітэта:

— Амаль ніяк. Навучыцеся чытаць са слоўнікам і пераказваць і на трэцім курсе здадзіце экзамен.

Ведаць не будзем, а экзамен здадзім. Можа, так і трэба? Тры гады вывучаць прадмет толькі для таго, каб у прыкладанні да дыплома мець ацэнку?

А мы ж павінны свабодна валодаць замежнай мовай, мець навыкі гутарковай мовы, умець чытаць тэксты без слоўніка!

Што, на наш погляд, трэба змяніць, каб у новым навучальным годзе не паўтараць старых памылак?

Не трэба ствараць такія стракатыя групы, як наша. Можна ж аб'яднаць усіх гуманітарнікаў (юрыстаў, журналістаў, студэнтаў беларускага і рускага аддзяленняў) аднаго курса ў групы з розным узроўнем падрыхтоўкі. Заняткі абедзвух груп павінны праходзіць у адзін час. Спачатку студэнты самі могуць выбраць сабе адпаведную групу па сваіх ведах, а ў працэсе вучобы, калі гэта будзе патрэбна, іх будуць пераводзіць з групы ў групу выкладчыкі. Гэта многіх студэнтаў прымусіла б быць стараннымі.

Змяніць методыку, бо яна зараз такая ж, як і ў школе, а мо' і горш. На першае месца трэба паставіць гутарковую мову. Завучваць цэлыя фразы, размоўныя формулы, таму што нават вялікі запас слоў і фармальныя веды граматыкі не даюць навыкаў гутарковай мовы. Англійскія словы пры чытанні скажаюцца, у такім выглядзе запамінаюцца і потым іх цяжка перавучваць.

Не спяшацца зазубрыць правілы — гэта мёртвая вага; нормы, мовы засвояцца ў працэсе размовы і чытання. На апошняе месца трэба паставіць арфаграфію. Гавораць, і Марк Твен не памятаў, як пішуцца асобныя словы. А мы губляем на гэта шмат часу.

У вывучэнні замежных моў можна і трэба выкарыстоўваць тэхніку: магнітафоны, грампласцінкі (у магазіне на Даўгабродскай іх шмат ёсць), тонфільмы, субстыраваныя фільмы. Універсітэт павінен у поўнай меры выкарыстоўваць гэтую магчымасць.

Не за гарамі і інстытут замежных моў — там не адмовяць у шэфстве над нашымі студэнтамі.

У нас часта спасылаюцца, што на вывучэнне замежнай мовы мала вызначана часу. І гэта праўда. Але праўда і тое, што многія студэнты прапускаюць і тыя дзве гадзіны ў тыдзень, бо заняткі мала чаго даюць. З двух магчымых — часу і якасці — яны выбіраюць апошняе.

Магчыма, мы ў нечым памыляемся, могуць быць і іншыя прапановы, але змены неабходны — гэта відавочна.

**І. ФІЦНЕР,**
**І. КАНАНОВІЧ,**
**студэнты I курса вячэрняга аддзялення журналістыкі.**

## *Вершы абітурыентаў*

## МАЯ АЛЁНКА

Я сваю каханую
Называю слаўнаю,
Зоркаю далёкаю,
Казкай сінявокаю.
У блакіце вочы
Утапіці хочуць,
Косы ільняныя,
Губкі — дзве маліны.
Дзе б ні йшоў, ні ехаў,
Чую яе смех я,
Смех маёй Алёнкі,
Гэткі звонкі, звонкі.
Маю ў руках сілу,
Плячам хопіць шыру.
«Сіла, — кажуць людзі,
Распірае грудзі».
Дам ёй зорку з неба —
Кажа: «Не не трэба».
Кажу: «Дам багацце».
Кажа: «Не, не шчасце».
І яшчэ мне кажа:
«Вось дзе шчасце наша —
Рукі маладыя,
Рукі залатыя».
Любая Алёнка
Стала маёй жонкай.
На работу рана
Я іду з каханай,
У маёй каханай
Ля станка прыбрана.
А ў мяне, як гляну,
Ажно сэрца вяне:
Ля станка — абрэзкі,
Стружкі і жалезкі.
Не ўзгарыцца ліха,
Усё будзе ціха,
Ніхто і не ўбача —
Хутка змены здача.
Час ужо дадому.
Чую ў целе стому.
А тут мне кахана
Кажа: «Дамоў рана.
Прыбяры спачатку,
Навядзі парадак, —
І яшчэ сказала: —
Каб усё тут ззяла!»
Вось якая жонка,
Любая Алёнка!
Я падумай крыху
Ды пачаў паціху
Прыбіраць абрэзкі,
Стружкі і жалезкі.
Мы пайшлі дадому.
Думкі ў сэрцы роем:
«Не, не памыліўся,
Што з ёй ажаніўся».
І купіў ёй ружы:
«Ну, не злуй на мужа».

**С. НАВУМЧЫК**

* * *

*Соф'я Ігнатаўна Навумчык працуе на торфабрыкетным заводзе «Беразінскі», што ў Маладзечанскім раёне. Сёлета яна падала заяву аб паступленні на першы курс завочнага аддзялення журналістыкі БДУ.*

# Яшчэ раз аб рабоце СНТ

*У 19-м нумары газеты «Беларускі універсітэт» было надрукавана выступленне студэнта 3 курса гістарычнага факультэта В. Насцюшонка, у якім узнімаліся некаторыя пытанні работы СНТ універсітэта. Сёння мы публікуем артыкул намесніка старшыні Савета СНТ універсітэта М. Грыгаровіча, напісаны ў адказ на выступленне В. Насцюшонка.*

Шмат разоў ужо аб рабоце студэнцкага навуковага таварыства універсітэта гаварылася як на вялікіх сходах, так і на малых пасяджэннях камітэтаў і бюро, але зрухі яшчэ вельмі малыя. Колькасць студэнцкіх навуковых работ расце. Але гэты рост вельмі малы ў параўнанні з ростам студэнцкага калектыву. Можна прывесці шмат лічбаў, якія гавораць аб тым, што СНТ не такая ўжо мнагалюдная арганізацыя ва універсітэце. А навука ж для студэнта павінна быць галоўнай мэтай, галоўным імкненнем.

Члены СНТ і само таварыства, на жаль, часта знаходзяцца на правах пасынкаў ва універсітэце. Не ўсе кафедры дастаткова клапацяцца аб павелічэнні ліку студэнтаў у студэнцкіх навуковых гуртках. Часта гэтаму перашкаджае і тое, што ў лабараторыях не хапае рабочых месц.

Чамусьці дагэтуль работу ў СНТ не лічуць сапраўднай грамадскай работай. Гуртkоўцаў часта адрываюць ад навуковай работы іншымі грамадскімі даручэннямі, якія патрабуюць шмат часу. Студэнт з імі, зразумела, не можа справіцца і атрымлівае спагнанне. Я мяркую, што работа ў студэнцкім навуковым таварыстве павінна лічыцца такой жа грамадскай работай, як і іншыя даручэнні.

Нярэдка непаладкі ў рабоце СНТ з'яўляюцца вынікам недастатковай увагі да яе з боку саміх членаў СНТ і членаў бюро СНТ. Нашы канферэнцыі праводзяцца яшчэ не на належным узроўні. Складваецца ўражанне, што ўсё гэта робіцца пад націскам непрыемнай небходнасці. Мауляў, з нас патрабуюць — калі ласка, мы зробім.

Новы савет СНТ прыкладзе ўсе намаганні, каб такое становішча не паўтаралася. Своечасова сабраць навуковыя работы студэнтаў; абвясціць усіх аб часе пачатку канферэнцыі; падабраць найбольш зручны час для яе правядзення, каб студэнты маглі прынясць удзел у ёй па меншай меры слухачамі; запрасіць выкладчыкаў на сходы і канферэнцыі — гэта, на жаль, яшчэ вельмі складаная справа ў нас. На апошнім жа справаздачна-перавыбарчым сходзе з выкладчыцкага саставу прысутнічалі лічаныя адзінкі.

Улічваючы вопыт работы мінулага Савета СНТ, будзем спадзявацца, што новы калектыў Савета ўнясе значныя змены ў работу. Павялічыцца колькасць студэнтаў, што займаюцца навуковай работай, канферэнцыі будуць праходзіць на належным узроўні. Але для гэтага неабходна жаданне і дапамога не толькі ўсіх членаў студэнцкага навуковага таварыства, але і ўсіх студэнтаў БДУ. Для таго ж кожны з нас і паступаў ва універсітэт, каб штурмаваць вяршыні навукі. Склаўшы рукі, гэтага не зробіш!

**М. ГРЫГАРОВІЧ.**

Ф Е Л Ь Е Т О Н

## А „двойку“ я атрымаю?

**Толькі гэта прысеў за крайні стол у 4-й чытальнай зале ў галоўным корпусе, толькі раскрыў падручнікі і пачаў чытаць, як прарэзліва-піскляве «гыр-р-ры-рып» паласнула бы нажом па сэрцы. Ведаеце, быццам хто незнарок царапнуў пазногцем па шыбе. Аж мурашкі па спіне пабеглі. Азірнуўся — нейкі дзядзька адчыніў напалову дзверы, абшарыў вачыма залу, буркнуў.**

**— Няма яго...**

**А праз хвіліну дзвер зараўла тыграм. Гэта высокі хлапец з сілай тузануў яе. Відаць, спяшаўся некуды. А вось дзяўчына, якая ішла за ім, адчыняла дзверы паволна. Дзверы заваркавалі голубам. Я ад задавальнення аж усміхнуўся і сказаў дзяўчыне:**

**— Дзякуй.**

**Толькі яна не зразумела. Паглядзела на мяне гэтак падазрона:**

**— Што, ужо таго?.. Завучыўся?**

**І так вось кожную хвіліну.**

**Не ведаю толькі, як я заспяваю на экзамене заўтра, бо колькі ні браўся чытаць падручнік, ад такога скрыпу нішто не ішло ў галаву.**

**Плюнуў і пайшоў вучыць на вакзал — усё ж там спакайней. А па дарозе думаў:**

**— Сарвалі б іх ці змазалі... А яшчэ лепш — замянілі б звычайнымі гардзінамі. Толькі б карысць ад гэтага была!**

С. КЕФ.

# Из словаря лентяя

Задание (домашнее) — неприятность, предусмотренная учебным планом.

Канитель — получение суточных и проездных перед практикой.

Конфуз — встреча с деканом на улице в полдень.

Ловкость — успеть убрать комнату в общежитии, пока санкомиссия стучится в дверь.

Ни пуха, ни пера — традиционное напрашивание на оскорбление.

Отличник — человек, отрекшийся от радостей жизни.

Расходы — печальный обряд, совершаемый ежедневно.

Справка — оправдательный документ за прогул.

Тютелька в тютельку — решение задачи с помощью тетради соседа.

Чудо — отлучка преподавателя из аудитории во время экзамена.

Юрьев день (например, «Вот тебе, бабушка, и Юрьев день!») — день выхода приказа о снятии со стипендии на месяц за прогулы.

(Из студенческих газет).

## *Иностранный юмор*

НАБОЛЕВШИЙ ВОПРОС

*Чем больше мы учим, тем больше мы знаем. Чем больше мы знаем, тем больше мы забываем. Чем больше мы забываем, тем меньше мы знаем. Чем меньше мы знаем, тем меньше мы забываем. Чем меньше мы забываем, тем больше мы знаем.*

*Так для чего же учиться?*

# КРИПТОГРАММА

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 12 | 9 | 18 | 5 | 7 | 19 | 16 | 7 | 8 | 3 |
| 2 | 14 | | 8 | 7 | 13 | 15 | 3 | 7 | 19 |
| 20 | 21 | — | 1 | 10 | 20 | 21 | | 3 | 2 |
| | 6 | 18 | 11 | 13 | 18 | | 17 | 18 | 13 |
| 7 | 5 | 18 | 4 | 7 | 11 | ! | | | |

*В этой криптограмме зашифрованы известные слова М. Горького. Попробуйте прочитать их.*

*I. 1, 2, 3, 4 — финансовое учреждение.*

*II. 5, 6, 5, 7, 8 — воинское подразделение.*

*III. 4, 9, 10, 11 — полуостров в Европейской части СССР.*

*IV. 12, 13, 14, 15 — место отдыха.*

*V. 16, 7, 8 — шахматно-шашечный термин.*

*VI. 17, 18, 19, 20, 21 — знак приветствия у военнослужащих.*

За рэдактара **Я. ЛЯХАЎ.**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 03931. Тыр. 2000. Зак. 2302.